Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 9 M 64(3a)

# Трэба выжыць!

Замест нацыянальнага адраджэння Беларусі,краіна даведзена да стану цяжка хворай,якой ужо патрэбна інтэнсіўная тэрапія.А даведзена яна да такога стану не звонкавымі фактарамі,а кіруючымі дзяржаўнымі структурамі Рэспублікі Беларусь.А чаму? – Таму,што у складзе Вярхоўнага савета і Урада нашай Краіны большасць складаюць не беларусы-патрыёты,а нашы каланізатары,псеўдаінтэрнацыяналісты,русіфікатары,бальшэвікі,марўшыя аб рэстаўрацыі СССР і КПСС,манкурты-нацыянальнанесвядомыя беларусы,выпадковыя людзі,папаўшыя сюды дзеля уласнай выгады.

Цяперашнія Вярхоўны савет і урад Рэспублікі Беларусь – гэта былыя кіруючыя дзяржаўныя структуры БССР.Пасля распада СССР і аўтаматычнай ліквідацыі БССР,яны павінны былі самараспусціцца,але яны гэтага не зрабілі.Дэпутатаў Вярхоунага савета БССР у склад Вярхоўнага савета новай беларускай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь ніхто не выбірау.Такім чынам,людзі (дэпутаты) Вярхоўнага савета БССР самачынна захапілі уладу у Вярхоўным савеце Рэспублікі Беларусь і назначылі сваіх члонкаў урада.Вярхоўны савет РБ не самараспусціўся нават пасля усенароднага рэферэндума,на якім больш за 400 тысяч грамадзян Беларусі выказаліся за датэрміновы роспуск яго.

У складзе Вярхоўнага савета Рэспублікі Беларусі нямала людзей,якія проста сабатуюць яго працу,паклёпнічаюць на нашы беларускія нацыянальныя сімвалы,гісторыю,мову,не хочачы прызнаць яее дзяржаўнай . А другой дзяржаунай мовай пад шырмай "афіцыяльнай" хочаць увесці рускую мову – другой дзяржавы,якая вякамі праводзіла гвалтоўную русіфікацыю заваеванай ей краіны – Беларусі.

Вот чаму,замест нацыянальнага адраджэння,наша бацькаўшчына аказалася у стане усеагульнага глыбокага крызіса: сельская гаспадарка у занепадзе і тамиоҹуе драмучы дзяржаўны феадалізм,ці,хужэйшы варыянт прыгоннага права.У цяжкім стане знаходзяцца прамысловасць,навука.Ідзе наступ на суверэнітэт і незалежнасць Беларусі.Пахабна асмеіваюцца,і ігнарыруюцца,скрыта і яўна падаўляюцца нацыянальны беларускі патрыятызм.Наша Бацькаушчына стала прахадным дваром і тут свабодна арудуюць а нярэдка і злачынствуюць чужынцы з усяго света.Злачыннасць стала шырока распаўсюджанай з'явай.Беларуская прэса чуць дыхае на ладан.Зато чужаземная не толька сваей масай,а нярэдка і зместам прыгнятае усё нацыянальнае,беларускае,вядзе сябе здзекліва.Беларусь застаецца засмечанай бальшэвіцкай і чужаземнай топанімікай,сімволікай,геральдыкай,у той час,як нацыянальныя і дзяраўныя беларускія адзнакі усё яшчэ сус-

vytoki.net

тракаюцца рэдка,а Iмёны шматлIкIх барадзбIтоў за незалежнасць сваей Айчыны,нацыянальных беларускIх дзеячоў культуры,навукI I г.д. састаюцца не увекавечанымI.

Iдзе час,а зрухI не к лепшаму,а к хужэйшаму.Ён пераканаўча паказаў,што цяперашнIя,у прынцыпе незаконныя,самазваныя,Вярхоўны савет I урад РэспублIкI Беларусь,не ўстане вывясцI нашу краIну Iз глыбачайшага усеагульнага крызIсу,а тым больш адрадзIць беларускIя народ I дзяржаву.Гэта у стане зрабIць толькI запраўдныя патрыёты сваей Бацькаушчыны.А пакуль што,застауся толька адзIн выхад - гэта неадкладны роспуск Вярхоўнага савета I адстаўка урада,як нездольных(не жадаючых) выканаць сваю дзяржаўную адраджэнчаскую мIсIю,не карыстаючыяся нI даверам,нI павагай у беларускага народа.

Жыве Беларусь!

220082. Менск
вул.Прытыцкага 38-19
МIрончык I.М.

Іван МIрончык
доктар медыцынскIх навук,
прафесар

vytoki.net